# Графіці forever

**27 сакавіка ў мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася першая ў гісторыі нашай краіны легальная выстава маладых беларускіх графіці-мастакоў "BY.DE".**

Мудрагелістая назва лёгка расчытваецца, калі ўспомніць, што менавіта "BY" — міжнародная пазнака нашай краіны, а "DE" — адпаведны "пароль" Федэратыўнай Рэспублікі Германія. Праект "BY.DE" арганізаваны пры падтрымцы Калегіі імя Тэадора Хойса (ФРГ).

Зразумелая і мэта выставы — паказаць мінскай публіцы мастацкі патэнцыял беларускага графіці і пазнаёміць з гэтым актуальным кірункам альтэрнатыўнага мастацтва.

Як адзначыў дырэктар галерэі "Універсітэт культуры" Дзяніс Барсукоў, культура вулічнага мастацтва — іншымі словамі, малюнкі, створаныя з дапамогай балончыкаў з фарбай на паверхні будынкаў, агароджаў і інш., — зарадзілася ў 60-я гады мінулага стагоддзя і стала вельмі папулярнай сярод моладзі ўсяго свету. На Захадзе графіці часта называюць "Art Crimes", падкрэсліваючы такім чынам яго несанкцыянаваны характар. Аднак узнік і "легальны" кірунак гэтага мастацтва: у спецыяльна прызначаных для малявання месцах можна прадэманстраваць свой талент не на хуткасць, а на прыгажосць і якасць выявы. Больш за тое, апошнім часам цікавасць да графіці праяўляюць нават маладыя прафесійныя мастакі, якія выконваюць яркія малюнкі аэразольнымі фарбамі ў псіхадэлічнай манеры.


Rest. Без назвы, 2010 г.


Дзяніс Авяр'янаў. Без назвы, 2009 г.

27 сакавіка перад вернісажам прайшоў семінар "Грамадскае значэнне графіці ў Беларусі і магчымасць супрацоўніцтва грамадства з мастакамі графіці", у якім узялі ўдзел аўтар і арганізатар праекта "BY.DE" студэнт факультэта міжнародных адносін БДУ Андрэй Янкавец; прадстаўнікі Беларускага саюза дызайнераў; вядомы мастак Павел Вайніцкі; знаны графіціст Сяргей Паўлавец і інш. Прысутныя абмеркавалі многія вострыя пытанні, звязаныя з графіці як альтэрнатыўным заняткам моладзі. Гучала шмат розных думак, часам дыяметральна супрацьлеглых. Але напрыканцы семінара, бадай, ужо ніхто не спрачаўся, прынамсі, з наступнымі высновамі: графіці — гэта ўжо асобны, самакаштоўны від мастацтва, які мусіць і ацэньвацца паводле прынятых у мастацтвазнаўстве крытэрыяў; графіці забараніць нельга, любыя забароны і санкцыі будуць мець адваротны эфект; найлепшае выйсце — шукаць адпаведную прастору і адпаведныя магчымасці для айчынных графіцістаў ва ўзаемадзеянні з дзяржаўнымі структурамі; графіцісты былі, ёсць і будуць да таго часу, пакуль маладыя людзі будуць адчуваць прагу выказвацца. Адным словам, графіці forever.

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ